ДАПАМОЖАМ НАШЫМ БРАТАМ ВЫЗВАЛІЦЦА З ПАД ЯРМА ПОЛЬСКІХ ПАНОЎ

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА БАЙЦОЎ, КАМАНДЗІРАЎ І ПАЛІТРАБОТНІКАЎ Н-СКАЙ ЧАСЦІ

Брацкі нам народ Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны падвяргаецца самай грубай, бессаромнай эксплаатацыі з боку польскіх памешчыкаў.

Вызваленне іх ад гэтага гнёту і бяспраўя з'яўляецца нашым свяшчэнным абавязкам і вялікай чэсцю.

Мы—вызваленцы, а не заваявальнікі, і, як сапраўдныя патрыёты нашай шчаслівай соцыялістычнай радзімы,—запэўнеем партыю і ўрад, што будзем гераічна біцца за вызваленне прыгнечаных народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Мы абавязваемся ўмелым прымяненнем вашай баявой тэхнікі перамагчы ворага малой кроўю, каб таварыш Сталін і наш урад сказалі: «выдатна».

Мы абавязваемся метка страляць, выдатна захоўваць тэхніку, зброю, строга захоўваць ваенную тайну. Загад камандзіра для нас—вышэйшы закон.

Мы будзем біцца за тое, каб атрымаць права нетрымі ўзняць Чырвоны Сцяг у Заходняй Беларусі.

Уперад, таварышы, да перамогі, за ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку!

Уперад, за Радзіму, за Сталіна!

З іменем вялікага таварыша Сталіна мы будзем мужна змагацца за справу сусветнага пролетарыята.

Па даручэнню мітынга падпісалі:

ФАНЫШЭУ, ПАРШУЦІН, браты ГРЫГОР'ЕВЫ.

БУДУ БІЦЦА, НЕ ШКАДУЮЧЫ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ

Пайшоўшы на службу ў Чырвоную Армію, я даў абяцанне сваім родным, што чэсна буду служыць радзіме, мужна абараняць яе ад ворагаў. Свайго абяцання я ніколі не забываю.

Каб умела абараняць радзіму, я з першага дня прабывання ў Чырвонай Арміі ўпорна авалодваў ваеннай справай, вывучаў баявую тэхніку. Поспехі маю выдатныя. Раней я працаваў заражаючым. Спецыяльнасцю гэтай аўладаў выдатна. Зараз пазначан наводчыкам, умела наводжу гарматы ў цэль, страляю без промаху.

Я вельмі добра разумею свой інтэрнацыянальны абавязак воіна РСЧА. І зараз, калі працоўныя Заходняй Беларусі чакаюць ад нас брацкай дапамогі, каб вызваліцца ад польскіх паноў-прыгнятальнікаў, я з радасцю, разам з усімі сваімі баявымі таварышамі, іду на барацьбу з ворагам.

Буду біцца, не шкадуючы свайго жыцця. Ворагу не паздаровіцца ад нашых магутных спарадаў. Веды і вопыт, якія я атрымаў за час службы ў радах Чырвонай Арміі, я пастараюся як след прымяніць на практыцы. Вораг будзе разгромлен і знішчан.

Чырвонаармеец С. АЛЬЖАНАЎ.

БАЯВАЯ ТЭХНІКА НАПАГАТОВЕ

Раней мне не прыходзілася глыбока вывучаць уласцівасці і баявое назначэнне тэхнікі, якой узброена наша падраздзяленне. Жадаючы ліквідаваць гэты недахоп, я паставіў перад сабой задачу — у найкарацейшы тэрмін вывучыць матэрыяльную частку і спосабы яе баявога прымянення. Разам з таварышамі Кавалёвым і Белым я ўвесь свабодны час аддаю вучобе.

Многа мне дапамог адзяжлённы камандзір тав. Беларынка. Ён умела абучаў нас, практычна паказваў, як дзейнічаць з механізмамі, як абыходзіцца з прыладамі.

Рэзультаты ў наяўнасці: я і многія мае таварышы быстра шагнулі ў справе авалодання баявой тэхнікай. І з кожным днём, з кожнай гадзінай ідзем уперад.

Я — кандыдат у члены большэвіцкай партыі, і сваю задачу бачу ў тым, каб асабістым прыкладам весці за сабой байцоў. Вось чаму я імкнуся як мага паўней вывучыць тэхніку, лабіцца выдатнага авалодання ёю. Па атрыманні баявога загада мы разгромім ворага, абрушым на яго ўсю магутнасць нашай тэхнікі і будзем біць яго, як падабае верным сынам народа-багатыра, народа, які заўсёды бязлітасна біў, б'е і будзе біць ворагаў сваёй любімай радзімы.

Чырвонаармеец П. С. СІДОРЫК.

ЗА ШЧАСЦЕ ПРАЦОЎНАГА ЧАЛАВЕЦТВА

...Сасновы лес. Вячэрняя цішыня. Тав. Малыгін адкрыў партыйны сход і зачытаў загад камандвання. Выступаўшыя ў спрачках былі нямногаслоўны. Чуліся цвёрдакаменныя, вогненныя словы армейскіх большэвікоў.

— На нашу долю, — гаворыць малады камандзір тав. Лундзін, — выпала вялікая чэсць са зброяй у руках вызваляць сваіх кроўных братоў — працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Я выдатна вывучыў сваю баявую машыну і змагу ўмела прымяніць яе ў барацьбе з ворагамі. Бяру на сябе абавязацельства граміць польскіх паноў таксама, як нашы баявыя таварышы білі самураяў у раёне возера Хасан.

У барацьбе за вызваленне прыгнечаных я з настойлівасцю і чэсцю выканаю ваенную прысягу і свяшчэнны абавязак перад радзімай, абавязак воіна-грамадзяніна.

Другім выступіў удзельнік баёў ля возера Хасан — ордэнаносец Жорнасенка.

— Я ўжо граміў нашых ворагаў — японскіх самураяў. Зараз я абавязваюся не пашкадаваць ні сваіх сіл, ні самога жыцця ў барацьбе за вызваленне прыгнечаных братоў. Якая-б цяжкая задача ні стаяла перада мною,—я яе выканаю з чэсцю. Пад сцягам вялікай партыі Леніна —Сталіна я павяду сваіх байцоў граміць ворагаў працоўных, вызваляючы братоў па класу, за шчасце ўсяго працоўнага чалавецтва.

Выступіўшы затым тав. Мураўёў сказаў:

— Задача комуністаў не толькі быць прыкладам у баі, але і ўсімі сваімі дзеяннямі і самаадданасцю натхняць масы байцоў і камандзіраў на паспяховы разгром ворагаў працоўных. Мы ідзем дапамагаць прыгнечаным братам, вызваляць іх ад нацыянальнага прыгнёту і бяспраўя.

Усе комуністы выразілі бязмежную любоў да сваёй Радзімы, гатоўнасць змагацца за вызваленне прыгнечаных братоў да поўнай перамогі над ворагамі.

М. СМІРНОЎ.

ГАРУЕ ТАМ БРАТ НАШ, ГІБЕЕ ПАД ПАНАМ

З-пад пушчаў Палесся, з-пад Нёмана, Сожа,
З-пад Пцічы, Дняпра і Заходняй Дзвіны,
З-пад стыку са светам чужым і варожым
Прышлі мы, Совецкай краіны сыны.

Раскажам табе мы праўдзіва быліны
Аб тым, як жылі мы і сталі мы чым,
Як мы разагнулі прыгнутыя спіны,
Сагрэтыя чулым прыглядам тваім.

Нам новыя далі раскрыты сягоння,
Вялікія сілы сабраны табой,
І самыя мудрыя ў свеце законы
Напісаны смела тваёю рукой.

Сям'ёю народаў шчаслівага краю,
Табой узгадованых у барацьбе,
Свайго вызвалення мы дзень услаўляем
І песню пра шчасце прыносім табе.

А там, за Сулою, па той бок граніцы,
Дзе звесілі дзюбы панура арлы,
Клянуць сваю долю, свой лёс чужаніцы
У панстве фашызма, крывавай імглы.

І сёння там ходзіць галеча ў лахмоцці
Пад звон набажэнства, пад голас маны,
І сёння там слёзы, нуда, безрабоцце,
Ды горкія песні, ды скаргі адны.

Загнаны ў падполле там лепшыя людзі,
На «крэсах усходніх» лютуе жандар.
За вольнае слова катуюць і судзяць,
Астрогі там поўны нявінных афяр.

Сялянскія гоні адзеты ў кайданы,
У вузкія межы ўвагнаны палі.
Гаруе там брат наш, гібее пад панам,—
Жахлівасцю вее з Заходняй зямлі.

А ў нас стаў квітнеючым край беларускі.
Змяніліся людзі, аблічча зямлі —
Заместа палосак, убогіх і вузкіх,
Калгасныя нівы, як мора, ляглі.

(З ПІСЬМА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА ВЯЛІКАМУ СТАЛІНУ).

ЗВЕРСКІЯ ЗДЗЕКІ НАД НАРОДАМІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Польскія памешчыкі і капіталісты, прывёўшыя краіну да поўнага паражэння, узмацняюць зверскія здзекі над працоўнымі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. За апошнія дні хваля рэквізіцый і канфіскацый пятлёй душыць усе сялянскія двары Заходняй Беларусі. Паліцэйскія банды і дружыны асадзнікаў ноччу, як шакалы, робяць непрарыўныя налёты на вёскі, выграбаючы зярно, фураж, палатно, вопратку і калёсную мазь, не пакідаючы харчавання нават дзецям. Так, напрыклад, у хутары Дуброўка ноччу, не глядзячы на жудасны плач і крыкі жанчын і старыкоў, паліцыя, як саранча, ачысціла ўсе двары хутара, узяла 8 кароў і 13 авечак. Такія-ж сцэны адначасова адбыліся ў вёсках Чырвонае і Стайкі.

З вёскі Рубяжэвічы першага верасня гвалтоўна ўвялі 180 коней. На жудасныя крыкі і просьбы старыкоў паліцэйскія адказалі збіваннем. Балі сяляне не ўніміліся і па пятах праследвалі грабіцеляў, іх зноў збівалі, або ўстрайвалі на іх аблавы, як на жывёлу. Недалёка ад Рубяжэвіч селянін працаваў на сваім кані ў полі; раптам ён умаляў жандарма пакінуць яму яго каня. Жандарм выпраг каня і скрыўся з ім у лес. Побач, на суседнім полі, адбываліся такія-ж здзекі: тут некальві жандармаў угналі 12 коней, напярэдадні расправіўшыся з сялянамі, якім гэтыя коні належалі.

Гэтыя дзікія здзекі над змучаным сялянствам польская правячая банда «абъясняе» ваеннымі патрэбамі. Усё гэта хлусня. Задоўга да вайны польская шляхта старанна апустошвала бедныя кішэні рабочага і селяніна цалымі дзесяткамі падаткаў і «нацыянальных фондаў». З рук рабочага і селяніна паліцыя вырывала апошні кавалак хлеба.

Прадажны ўрад польскіх памешчыкаў і фабрыкантаў усё гэта прыкішэньваў і загадзя вывозіў за граніцу на свае асабістыя рахункі. Гэта мерзкая і подлая работа польскіх заправіл прывяла к таму, што першым уцёк у Румынію міністр фінансаў Бяткоўскі з залатымі кубышкамі, за ім міністр замежных спраў Бек адправіў асабістыя грузы ў Чэрнавіцы (Румынія). Астатнія народныя грошы ўрад увозіць на бронемашынах таксама ў Румынію. Вось яны — «абаронцы польскай дзяржавы».

У пачатку польска-германскай вайны ксяндзы кракаўскага іезуіцкага манастыра гаварылі сваім веруючым: «Не пашкадуем жыватоў сваіх за нашу радзіму». А калі раздаліся першыя гарматныя выстралы, усе яны збеглі за граніцу і ўвезлі з сабой 13 тысяч злотых з касцёльнай касы.

Кіруючая зграя жулікаў і казнакрадаў яшчэ да вайны не спыняла міжусобнай бойкі за казённы пірог. Так, напрыклад, гарадскі галава Варшавы Р. Стажынскі яшчэ ў мінулым годзе судзіўся як злодзей і раскрадальнік народных грошай. Скарыстоўваючы сваё службовае становішча, ён хадзіў па гарадскіх касах і браў ахтуль грошы, як з уласнага капялька. Суд ускрыў агідную карціну. Аказалася, такім казённым грабяжом старанна займаўся сам глава ўрада, узяржыморда — Славой-Складкоўскі. Вядома, што на суд ён не з'явіўся і загадаў прыкрыць судовую крамку.

Беларускі селянін не мае права мець радыёпрыёмнік, гаварыць аб вайне, аб СССР і наогул аб палітычных пытаннях; за ўсё гэта яму пагражае 15 год катаргі ў канцэнтрацыйным лагеры Бяроза-Картуска, які расцвітаецца з кожным днём. Так, напрыклад, у вёсках Осава, Спенкі, Слабада над сялянамі наладзілі экзекуцыю толькі за тое, што сяроп сялян узнімалі такія размовы: «Нашы правіцелі ад дапамогі СССР адмовіліся, грошы пракуцілі і пражралі на шакалад, таму і справы ў іх не ідуць на лад». У м. Докшыцах над народам здзекаваліся за тое, што там гаварылі: «Мы не хочам вайны, няхай немцы біруць сваё, а мы пойдзем у СССР. Даволі цягнуць панскую лямку».

Не дзіўна таму, што ў вёсках Глыбокае, Салонае, Луткі і Парфіёнава з'явіліся партызанскія атрады. Абураныя сяляне знішчаюць памешчыкаў, робяць налёты на ўрадавыя ўстановы і тэлеграфныя лініі і своечасова ўскальзваюць ад карных урадавых банд.

У радзе сёл сяляне самасудам расправляюцца з паліцэйскімі і памешчыкамі, прыгаварваючы: «З такой нечысцю да СССР далучацца нельга. У новы дом грязь не посяць».

Такіх фактаў можна прывесці вялікую колькасць і ўсе яны сведчаць аб тым, што цярпенне беларускага селяніна прыйшло к канцу. Рабочы і селянін рашуча пратестуюць супроць вайны, якая вядзецца ў інтарэсах польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Яны рэволюцыйным шляхам дабіваюцца таго свабоднага і радаснага жыцця, аб якім яны марылі дваццаць год, змагаючыся пад ярмом польскіх памешчыкаў і капіталістаў, звяртаючы свае змучаныя позіркі ў бок СССР — бацькаўшчыны працоўных усяго свету.

Н. ЧУБАКОЎ.

ПОЛЬСКІЯ ПАНЫ—ВЕКАВЕЧНЫЯ ВОРАГІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Гісторыя рускага, украінскага і беларускага народаў на ўсім яе працяжэнні непадзельна. Рускім, украінцам і беларусам прыходзілася бесперапынна весці барацьбу за сваю нацыянальную незалежнасць супроць польскіх захватчыкаў.

У далёкія вякі ўходзіць гісторыя беларускага народа. У даўнія часы разам з іншымі рускімі плямёнамі прышлі продкі беларускага народа — плямёны крывічоў, дрыгвічоў і драўлян у даліны рэк Дняпра, Заходняй Дзвіны, Бярэзіны, Сожа, Прыпяці і Нёмана. Яны заснавалі рад старажытнейшых паселішчаў — Тураў, Полацк, Мінск, Пінск і іншыя гарады. Вільна доўгі час з'яўлялася сталіцай беларускага народа. Польскія паны яшчэ ў XIII і XIV вяках грабежніцка захвацілі нашы землі, зрабілі беларускіх сялян сваімі прыгоннымі. Беларускі народ перанёс многа здзекаў і гнёту ад польскіх паноў. Польскія каралі адбіралі беларускія землі і раздавалі іх панам. Так, напрыклад, у 1590 годзе польскі сейм пастанавіў раздаць памешчыкам зямлю Украіны і Беларусі. Лепшыя землі былі адабраны ў беларускага народа і перададзены панам. Князь Лукамскі ўладаў цэлым Крычаўскім староствам, у Казіміра Сапегі было 700 тыс. дзесяцін зямлі і звыш 300 тысяч прыгонных сялян. Паны самаўласна распараджаліся жыццём беларускага народа. У кожным панскім маёнтку стаяла шыбеніца. Ксяндзы і панская чэлядзь усяляк здзекаваліся над «хамскай» беларускай мовай і прымушалі беларусоў гаварыць на чужой, польскай мове. Непакорных катавалі ў склепах палацаў, аблівалі на марозе вадой і замаражвалі іх. Гэта быў час цяжкага гнёту і бяспраўя беларускага народа, які знаходзіўся пад ярмом польскіх паноў. Польскія паны з'яўляюцца злейшымі векавечнымі ворагамі рускага, украінскага і беларускага народа.

У канцы XVI і ў пачатку XVII веку польскія захватчыкі зрабілі спробу заняволіць і рускі народ. Яны двойчы прабавалі аўладаць Масквой і паставіць свайго стаўленіка царом. Але вялікі рускі народ на чале з Мініцым і Пажарскім у 1611—1612 гг. падняўся супроць польскіх захватчыкаў, разбіў іх і выгнаў з сваіх зямель.

Але беларускі народ усё яшчэ знаходзіўся пад уладай польскіх паноў.

Па прапягу многіх вякоў ішла ўпорная барацьба з польскімі панамі, векавечнымі ворагамі рускага, беларускага і украінскага народа.

У 1595 годзе адбываецца народнае паўстанне пад кіраўніцтвам Налівайка. Гэтае паўстанне ахватвае вялікія прасторы ад Магілева да Слуцка. Польскія паны люта падаўляюць паўстанне, а Налівайка пасля страшэнных катаванняў быў чацвертаваны.

У 1623 годзе паднімаецца народнае паўстанне ў Віцебску. У 1629 годзе выступае украінская казацкая беднота пад вадзіцельствам Тараса Трасіла. У 1637 годзе адбываецца паўстанне украінскага казацтва пад кіраўніцтвам Паўлюка. Беларускі народ актыўна падтрымліваў гэтыя народныя паўстанні на Украіне.

У 1648—1654 гадах украінскі і беларускі народ разам паднімаюцца пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага супроць польскіх паноў. Пасля доўгай крывапралітнай вайны захватчыкі былі выгнаны з Украіны і Беларусі. Аднак значная частка тэрыторыі Беларусі ўсё яшчэ аставалася ў руках польскіх паноў. Да самай Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі паны бязлітасна эксплаатавалі ўвесь беларускі народ. Польскім памешчыкам належалі лепшыя землі. Адна княгіня Гогенлое ўладала 712 тысячамі дзесяцін зямлі, князь Віттгенштэйн — каля 700 тысяч, князь Радзівіл у адной Мінскай губерні меў 200 тысяч дзесяцін зямлі, пан Пусловскі—90 тысяч дзесяцін зямлі, пан Скірмунт — 47 тысяч дзесяцін зямлі.

Усю гэту зямлю, якая была награблена панамі, вярнула беларускаму народу Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя.

Польская дзяржава, дзякуючы рэволюцыі, стала самастойнай у 1918 годзе. Але ў Польшчы ўладу захвацілі капіталісты і памешчыкі. Польскія паны сталі ва ўладзе ў буржуазнай Польшчы. Пачалі зноў прыгнятаць працоўныя масы.

У пачатку 1919 года яны кінулі сваё войска для грабежніцкага захвату Беларусі і Украіны. Польская акупацыя па сваіх жахах, зверству і крывавым тэрору пераўзышла любыя злачынствы варвараў. Па ўсёй краіне выраслі шыбеніцы. Белапалякі разбуралі і спальвалі гарады. Польскія паны кулямётамі заганялі сялян у палаючыя вёскі, спальвалі жывымі людзей, не спыняліся перад забойствам старыкоў, старух і малых дзяцей, гвалтавалі жанчын. У сялян адбіралі хлеб, жывёлу, усю маёмасць.

Наша слаўная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія разбіла і выгнала польскіх акупантаў, вызваліла Совецкую Беларусь.

Польскія паны, пад відам бежанцаў з Польшчы, перакідвалі да нас шпіёнаў, дыверсантаў, грабежнікаў, забойцаў. Яны марылі з дапамогай беларускіх буржуазных нацыяналістаў, захваціць Совецкую Беларусь. Але гэта ім не ўдалося. Іх планы праваліліся.

Цяжкае жыццё беларускага народа па той бок граніцы. Польшча — дзяржава многанацыянальная. Нацыянальныя меншасці складаюць звыш 40 процантаў усяго насельніцтва. 20 процантаў насельніцтва яе — украінцы, 9 — беларусы, 8 — яўрэі, 3,9 проц.—немцы. Дзікім тэрорам, крывавымі катрэмамі польскія памешчыкі і капіталісты ператвалі задушыць рэволюцыйны рух у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі. Але гэта ім не ўдалося. У чэрвені 1933 года супроць улады паноў паднялося звыш 100 тысяч сялян Галіцыі. У 1935 годзе паўсталі сяляне Валыні і Сувальшчыны. У жніўні 1937 года сялянская забастоўка ахватвае ўсю Польшчу. Адбываліся сапраўдныя баі паміж сялянамі і паліцыяй. Па ўсёй Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі няўхільна развіваецца магутны рэволюцыйны рух.

Панская польская дзяржава пры першых-жа ваенных сутычках стала развальвацца. Інакш і быць не магло. Польскі ўрад трымаўся на небяспечнай аснове, на прыгнечанні народных мас, на ваенных авантурах, на бесчалавечным заняволенні беларусаў, украінцаў і інш. нацыянальнасцей, насялячых Польшчу. За паноў, за капіталістаў народ не пажадаў ваяваць.

У радзе гарадоў Заходняй Беларусі і Украіны ўзвіўся чырвоны сцяг паўстання. Нашы браты заклікаюць нас на дапамогу.

Наш інтэрнацыянальны абавязак — прыйсці на дапамогу нашым братам, дапамагчы ім пазбавіцца ад гнёту векавечных ворагаў—польскіх паноў.

Т. ГАРБУНОЎ.

СТАНОВІШЧА ПРАЦОЎНЫХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Па той бок граніцы, дзе яшчэ панус фашысцкі рэжым грабяжу, эксплаатацыі і варварства, — у Заходняй Беларусі каля 3 мільёнаў беларусоў стогнуць ад непасільнага ярма капіталістычнага гнёту, рабства і прыгнечання.

Пануючы капіталістычны клас Польшчы зрабіў усё магчымае, каб ператварыць Заходнюю Беларусь у калонію з матай нажывы, а мільёны працоўных пакінуць на галоднае існаванне, цёмру і поўнае бяспраўе.

У Заходняй Беларусі, а таксама ў Заходняй Украіне правячыя кругі Польшчы насаджаюць на сялянскай зямлі сваіх «асаднікаў» — польскіх ваенных каланістаў. Ва ўсім дзяржаўным і адміністрацыйным апараце пануе польская мова.

Культурныя ўстановы і школы нацыянальных меншасцей амаль усе закрыты. У Польшчы беларусам і украінцам забараняецца вучыць дзяцей на сваёй роднай мове.

Гаспадарка панскай Польшчы ўжо на працягу многіх год знаходзіцца ў стане застою і заняпаду. Узровень вытворчасці прадукцыі зніжаецца. Фабрыканты і памешчыкі імкнуцца ўвесь цяжар гаспадарчага крызіса ўзваліць на плечы працоўных.

Адзін з польскіх пісьменнікаў, апісваючы жудасны малюнак жабрацтва, гнёту і безвыходнай галечы народных мас Польшчы, піша:

«Каб даць характарыстыку становішча народа, трэба-б пісаць не пяром, а кулаком, не скаргамі, а праклёнцем, не кроўю, а жалезам».

Не менш змрочнымі фарбамі рысуе жыццё народных мас у Польшчы варшаўская газета «Роботнік»:

«Некалькі мільёнаў людзей у краіне прызнаны «лішнімі». Прынамсі чацвертая частка насельніцтва не мае магчымасці паесціся ўдосталь. Пятая частка не ўмее ні пісаць, ні чытаць. Каля мільёна дзяцей не вучацца ў школе».

Працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і Польшчы прыходзіцца штодня расплачвацца за авантурыстычную палітыку польскага фашызма.

Ва ўсіх галінах польскай прамысловасці назіраецца заняпад, які суправаджаецца велізарным ростам эксплаатацыі рабочых і растучым разарэннем працоўных мас сялянства. У Польшчы налічваецца 9-мільённая армія беспрацоўных. Беспрацоўе — страшэнны біч, крыніца жахлівых бядот насельніцтва. Пры наяўнасці 9-мільённай арміі беспрацоўных становішча занятых на прадпрыемствах рабочых таксама вельмі цяжкое.

Вось як апісвае жыццё рабочых Польшчы амерыканскі журналіст у сваім артыкуле, надрукаваным у швейцарскай газеце «Рандшау»:

«Мы ўваходзім у нізкі доўгі барак. Тут у часе вайны трымалі палонных. На вокнах захаваліся яшчэ рашоткі. Мы атрымаем дзверы ў адну з «кватэр», знаёмімся. Стары адкачык, стомлены, азлоблены чалавек.

— Як жывеш?

— Мучаемся, і толькі. Калі, нарэшце, гэта зменіцца? У мяне пяцёра дзяцей, а працую я адзін. Як жыць?»

Вось як ён апісвае сваю паездку ў Балуты:

«Мы паехалі ў Балуты — квартал у паўночным раёне Лодзі. Паўрал ні можна дзе ў свеце знайсці такія жалкія трушчобы. Уваходзім у невялікі дом. Знадворку — надпіс: «Здаецца месца для спання». Тут жыве адзін з «ткачоў на даму», якіх так многа ў Балутах. Нізкі пакой поўнасцю занаўняе старадаўні драўляны ткацкі станок. Мы ледзь прабіраемся міма станка ў поўнёмную кухню. За гэту «кватэру» траба кожныя тры месяцы плаціць 70 злотых. Старому ткачу ўжо 50 год. Прадпрыймальнік дае яму «сыравіну», і старык тчэ для яго вясковыя хусткі. Са старым працуе і падмайстар, які зарабляе 40 злотых у месяц. У яго жонка і дзіця... Стары і яго падмайстар працуюць кожны дзень пры цьмяным, штучным святле 14—15 гадзін і чапляюцца за гэтую работу, як за найвялікшае шчасце, бо без яе пастае жах і беспрацоўе.

У гэтым горадзе гарадское самакіраўніцтва амаль не мае ніякай уласнай гаспадаркі. Трамвай, гарадская электрастанцыя, газ — усё гэта належыць прыватнаму капіталу. Лазні прыносяць малыя даходы, таму іх усяго адзе на 660 тысяч насельніцтва.

Драўляныя домікі, брукаваныя буйным камяннем вуліцы, грязь і жудасная эксплаатацыя асталіся тут такімі-ж, якімі яны былі пры царскім губернатары».

Рабочы дзень на ўсіх прадпрыемствах Польшчы павялічваецца. У многіх выпадках ён раўняецца 14—16 гадзінам. Зарплата зніжаецца.

Асабліва цяжкі лёс беларускага рабочага і батрака. Пры існуючым у Польшчы нацыянальным гнёце, пры беспрацоўі, пры прамысловым застоі працоўным беларусам амаль немагчыма атрымаць работу. Над імі заўсёды вісіць страшэнная пагроза — быць асуджаным з сям'ёй на галоднае існаванне і нечалавечыя пакуты а часта і на смерць.

Яшчэ горш жыве працоўнае сялянства ў Заходняй Беларусі. Мільёны сялян Польшчы пакутуюць ад малазямелля і бяззямелля. Сяляне задыхаюцца ад зямельнага голаду. Каля 50 процантаў усёй зямельнай плошчы знаходзіцца ў руках польскіх магнатаў. Сяляне ўладаюць самымі горшымі, забалочанымі, закінутымі землямі. 30 тысяч паноў маюць у два з палавінай раза больш зямлі, чым два з палавінай мільёна сялянскіх двароў.

Сучасная Польшча па сваёй галечы пакінула далёка ззаду нават галодную вёску царскай Расіі. У вёсках Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пануюць голад і страшэннае жабрацтва.

Для характарыстыкі становішча працоўнага сялянства ў Заходняй Беларусі прывядзем некалькі вытрымак з «пісем сялян», апублікаваных польскім інстытутам сацыяльнай эканомікі, установай, якую ніхто не западозрыць у згушчэнні фарбаў. Гэтыя дакументы — суровы абвінавачы акт па адрасу фашысцкай дыктатуры ў Польшчы.

Вось адно з пісем:

«Галеча ў вёсках жахлівая. З бедных сялян толькі нямногія маюць хлеб, а мяса ядуць толькі на каляды і на вялікдзень, і то не заўсёды. Дзеці марнеюць і абрастаюць гразззю». (Пісьмо селяніна з Ласкага павета).

У другім пісьме пішуць:

«Цяпер мы адмаўляем сабе літаральна ва ўсім. Цукру мы не ўжываем, хіба толькі ў вялікія святы, а соль эканомім —яна вельмі дарагая. Жанчыны нераносяць агонь з хому ў дом у жалезных гаршках, а кожную запалку я дзялю на дзве, а часам на чатыры часткі. Карасін і лампы ў нас у вёсцы — гэта роскаш. Хаты асвятляюцца проста лучынай».

Даходы сялянства ў Заходняй Беларусі змяншаюцца з кожным годам. Нізкі ўраджай і ненасільныя падаткі канчаткова разараюць сялян.

Дапамагаючы фабрыкантам і панам грабіць працоўных, выціскаючы з народа апошнія сокі падаткамі, польскі ўрад давёў працоўнае насельніцтва да крайняй галечы і голаду.

Тыф, туберкулёз і іншыя хваробы штогод забіраюць сотні тысяч афяр. Палавіна дзяцей сялян Заходняй Беларусі, не дасягнуўшы сямігадовага ўзросту, гіне ад голаду і заразных хвароб. Для характарыстыкі становішча прывядзем некаторыя вытрымкі з карэспандэнцый, змешчаных польскім друкам.

«У нашай вёсны на 60 гаспадарак толькі адзе гаспадаркі не абнажараны падаткамі і забяспечаны хлебам. Астатнія сяляне — гэта проста жабракі, у якіх няма ні ежы, ні адзення», — так характарызуе становішча ў вёсны селянін Палгайскага павета ў сваім адказе на анкету польскага дзяржаўнага аграрнага інстытута.

Або вось другі адказ з той-жа анкеты:

«У вёсны ў нас гора, — піша селянін К., — хлеба мы даўно не елі. Туберкулёз амаль у кожнай хаце. Ураджайнасць дранная з-за адсутнасці штучных угнаенняў. Людзі, асабліва дзеці, выглядаюць як пасля тыфа: бледныя, слабыя. Дранна ў нас, вельмі дранна».

Прадстаўнікі пануючага класа Польшчы ўжо самі не ў стане ўтоіць жахлівае становішча народных мас. Сенатар Бараноўскі, выступаючы яшчэ ў 1938 годзе ў бюджэтнай камісіі польскага сената, настойваў на ўвядзенні поркі для зняволеных у турмах, бо інакш турма не можа лічыцца пакараннем для большасці беларускіх сялян. «Калі ўзяць не толькі-што захуталую вёсачку на Палессі, — заявіў ён, — а хоць-бы першую, якая пападзецца, вёску пад Варшавай, то малазямельнае сялянства тут жыве ў такіх цяжкіх умовах, што нават турэмны ложак і карасінавая лампа могуць здаваць ім прывабнымі».

Па сведчанню «Газеты Варшаўска» на Палессі сялянам—беларусам і украінцам —не толькі няма чаго есці, але і няма дзе знайсці работы. Праязджаючыя праз сёлы могуць бачыць цэлыя натоўпы блукаючых беспрацоўных сялян. На пытанне, што яны робяць, чуюць адказ: «галадаем, паночкі».

Голад — пастаянны госць у сялян Заходняй Беларусі. У некаторых вёсках нельга знайсці нават солі. Большасць хат асвятляецца лучынай. На Палессі і ў прыватнасці ў Новагрудскім ваяводстве ёсць цэлыя населішчы, дзе 90 процантаў насельніцтва хварае туберкулёзам. Медыцынская дапамога адсутнічае, урачоў мала, а больніц яшчэ менш. Непасільныя падаткі, павіннасці і адпрацоўкі душаць беларускіх сялян, выціскаюць з іх апошнія сокі. Характарызуючы гаспадарчае развіццё Заходняй Беларусі, газета «Курэр поранны» вымушана была зрабіць вывад аб надзвычайнай адсталасці і жабрацтве сялян ля берагоў Нёмана, Днестра і Прыпяці.

Палітыка польскага фашызма вядзе Заходнюю Беларусь да культурнага адзічання. Аб гэтым вымушан сказаць нават афіцыяльны орган міністэрства «рэлігійных вераспаводанняў і народнай асветы». Ён піша, што каля трох мільёнаў моладзі знаходзіцца па-за школай. У Заходняй Беларусі ёсць паветы, дзе непісьменныя складаюць 70 проц. насельніцтва, а сярод жанчын — 90 і 95.

У Заходняй Беларусі крызіс народнай асветы пагрыбляецца яшчэ і тым, што ўсе беларускія школы закрыты. Дзеці павінны навучацца на незразумелай ім польскай мове. Колькасць непісьменных у Польшчы складае каля 12 мільёнаў чалавек.

Польскі пан з'яўляецца неабмежаваным уладаром па вёсцы. Забойствы батракоў і сялян памешчыкамі і іх найміцямі з'яўляюцца звычайнай справай у панскай Польшчы і астаюцца беспакаранымі. Цяперашні глава польскага ўрада Славой-Складкоўскі з'яўляецца «выпрабаваным усмірыцелем». Яму належаць словы: «Паліцыя на тое і існуе, каб страляць, яна страляе і будзе страляць».

Польская «канстытуцыя», уведзеная ў сакавіку 1935 года, пазбавіла працоўных масы Польшчы ўсіх палітычных правоў.

Польскі ўрад абапіраецца на насілле, зверска прыгнятае працоўных, асабліва нацыянальныя меншасці — украінцаў, беларусоў, яўрэяў. Нацыянальныя меншасці ненавідзяць сваіх прыгнятальнікаў. Працоўныя масы гарадоў і вёсак Заходняй Беларусі і ўсёй Польшчы паднімаюцца на барацьбу з крывавым фашызмам, які даў народу толькі пакуты, беспрацоўе, невыносны гнёт і эксплаатацыю.

Абурэнне мільёнаў працоўных супроць польскіх паноў расце з кожным днём. Рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пачалі барацьбу са сваімі адвечнымі злейшымі ворагамі—польскімі панамі, пачалі барацьбу за свабоднае і шчаслівае жыццё.

Пана Совецкая эрдзянаносная Беларусь і Совецкая залатая Украіна з'яўляюцца пуцяводнымі зоркамі для працоўных Польшчы. Позіркі прыгнечаных звернуты да радзімы соцыялізма — СССР. Позіркі трохмільённага беларускага народа, які стогне пад ігам польскіх паноў, накіраваны на краіну Советаў, якая жыве радасным, шчаслівым і багатым жыццём, на краіну, якой кіруе партыя большэвікоў і мудры Сталін.

Працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны зразумелі, што адзіны шлях да выхаду з бяспраўя і гнёту — гэта шлях барацьбы пад баявым чырвоным сцягам супроць панавання капіталістаў, шлях барацьбы за ўладу рабочых і сялян.

Наш свяшчэнны абавязак — дапамагчы нашым родным братам вызваліцца з-пад улады капіталістаў і памешчыкаў.

Г. ЦІМОХАЎ.